**Гарбачоў, М.** Душманы баяліся дэсантнікаў / М. Гарбачоў // Лепельскі край. – 2017. – 1 жн. – С. 3.

## ДУШМАНЫ БАЯЛІСЯ ДЭСАНТНІКАЎ

Гэтаму элітнаму вайсковаму злучэнню даручалася выкананне самых важных і складаных аперацый супраць душманаў, напрыклад, штурм палаца Аміна ў Кабуле ў снежні 1979 года. У тагачаснай знакамітай паветрана-дэсантнай дывізіі служылі многія нашы землякі. Сярод іх – Генадзь Мурашка з вёскі Ладасна.

Як жа трапіў Генадзь Валянцінавіч на сапраўдную вайну, якая разгарнулася ў той час за тысячы кіламетраў ад яго родных мясцін?! Пасля заканчэння васьмі класаў Каменскай СШ і Лепельскага СПТВ–175 у кастрычніку 1986 года вясковы хлопец быў прызваны на тэрміновую службу ў армію. У Фергане (Узбекістан) шэсць месяцаў адточваў ваеннае майстэрства ў спецыяльным вучэбным цэнтры. Займаліся баявой, маральна-палітычнай і агульнафізічнай падрыхтоўкай, шліфавалі ўменні валодання рознымі відамі стралковай зброі і практычныя навыкі ваеннага супрацьстаяння ва ўмовах нязвыклай горнай мясцовасці. Вучыліся скакаць з парашутам з самалетаў АН–2, АН–12 і ІЛ–76. У пачатку мая 1987 года Генадзь Мурашка на самалёце быў дастаўлены на аэрадром, а затым у размешчаныя паблізу вайсковыя казармы ў Кабуле, дзе быў раскватэраваны 350-ы паветрана-дэсантны полк 103-й Віцебскай паветрана-дэсантнай дывізіі. Побач дыслакавалася артылерыйская часць і сам штаб воінскага злучэння.

– Удзельнічаў у ванскових аперацыях па ахове калон грузавых аўтамашын на горных серпанцінах, – адзначыў Генадзь Валянцінавіч. – Асабліва запомніліся баявыя дзеянні па дэблакаванні «дарогі жыцця» з Кабула ў горад Хост. Там знаходзіўся гарнізон савецкіх войскаў. Душманы паспрабавалі поўнасцю паралізаваць рух на гэтай транспартнай артэрыі. Найбольш вострыя агнявыя сутыкненні адбываліся ў снежні 1987 года – лютым 1988 года. Наш узвод у гэты час знаходзіўся на адным з апорных пунктаў на гэтай дарозе. Ноччу займалі кругавую абарону, выстаўлялі надзейную ахову па ўсіх накірунках, а днём сапёры абясшкоджвалі міны на праезнай частцы шашы, а мы выяўлялі і знішчалі варожыя засады ў зонах сваёй адказнасці. Самі мы перамяшчаліся на БМП, каб да мінімуму звесці страты асабовага саставу.

– Якая была экіпіроўка?

– На час асобнай трохдзённай дыслакацыі кожнаму стралку выдаваліся патроны да аўтамата АКС, гранаты РГД–5, іншыя боепрыпасы. У заплечны рэчавы мяшок дэсантніка змяшчаўся сухі паёк харчавання, цёплае адзенне, сродкі асабістай гігіены.

Часам вага ўсяго гэтага набліжалася да 50 кілаграмаў. Спераду ў якасці супрацьвагі і зручнасці для выкарыстання пры раптоўным баявым сутыкненні з душманамі віселі два падсумкі. У адным з іх было два ражкі для аўтамата АКС з трыццаццю патронамі ў кожным, а ў другім – дзве гранаты РГД–5.

– Ці ўзнагароджваліся за ўдзел у баявых аперацыях?

– Медалём «За адзнаку ў вайсковай службе II ступені».

– Якія засталіся агульныя ўражанні?

– Душманы баяліся дэсантнікаў, ніколі самі не нападалі на нас, сгараліся пазбегнуць прамых сутыкненняў.

– Калі пакінулі тэрыторыю Афганістана?

– У канцы студзеня 1989 года разам са шпіталем нашай вайсковай часці, дзе праходзіў лячэнне ад хваробы, быў эвакуяваны ў Ташкент.

– Як склалася жыццё ў мірны час?

– Вярнуўся на малую радзіму. У жніўні 1989 года ажаніўся.

Жонка Надзея нарадзілася і вырасла ў суседняй вёсцы Заазёрная. Перабраўся на пастаяннае месца жыхарства ў Бароўку, уладкаваўся электраманцёрам у мясцовую КЭЧ. Жонка рупіцца ва ўстанове аховы здароўя «Лепельскі ваенны санаторый» Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Выхавалі дваіх дзяцей. Сын Аляксандр ужо мае сваю сям'ю, працуе машыністам вежавага крана ў будаўнічай арганізацыі горада Мінска. Унучцы Алісе ў маі споўніўся адзін год.

Дачка Наталля сёлета выйшла замуж, працуе музычным кіраўніком у дзіцячым садзе гарадскога пасёлка Руба, што пад Віцебскам.

*Мікалай* ***ГАРБАЧОЎ***